# ДЭТЭКТЫЎНА-ПРЫГОДНІЦКІЯ ТВОРЫ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА: ТРАДЫЦЫІ І НАВАТАРСТВА

**А. С. Пашкевіч**

*УА “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”, Брэст, Рэспубліка Беларусь,* box@brsu.by

У артыкуле акцэнтуецца ўвага на традыцыйным і наватарскім у дэтэктыўна-прыгодніцкіх творах У. Караткевіча, выяўляецца іх мастацкая спецыфіка і ідэйны змест.

***Ключавыя словы:*** дэтэктыўна-прыгодніцкая проза; прыёмы; сюжэт; гуманістычныя ідэалы.

# ДЕТЕКТИВНО-ПРИКЛЮЧЕНЧЕСКИЕ ПРОИЗВЕДЕНИЯ ВЛАДИМИРА КОРОТКЕВИЧА: ТРАДИЦИИ И НОВАТОРСТВА

**Е. С. Пашкевич**

*УО “Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина”, Брест, Республика Беларусь,* box@brsu.by

В статье акцентируется внимание на традиционном и новаторском в детективно-приключенческих произведениях В. Короткевича, выявляется их художественная специфика и идейное содержание.

***Ключевыя слова:*** детективно-приключенческая проза; приемы; сюжет; гуманистические идеалы.

Уладзімір Караткевіч – адзін з тых беларускіх творцаў, якія ў другой палове XX стагоддзя востра адчулі неабходнасць ідэйна-тэматычнага і жанрава-стылёвага абнаўлення нацыянальнай літаратуры. Ён плённа развіваў не толькі гістарычную, але і дэтэктыўна-прыгодніцкую прозу, у рэчышчы якой напісаны яго аповесці “Загадка Неферціці”, “Дзікае паляванне караля Стаха”, “Ладдзя Роспачы”, раманы “Хрыстос прызямліўся ў Гародні” і “Чорны замак Альшанскі”.

Пры аглядзе беларускай прыгодніцкай прозы ў Векіпедыіі адзначаецца, што “У. Караткевіч сам сябе небеспадстаўна называў беларускім Аляксандрам Дзюма”; заўважаецца, што “яго гісторыка-прыгодніцкія творы вылучаюцца рамантычнай скіраванасцю, высокай мастацкай культурай і патрыятызмам”; згадваецца яго першая прыгодніцкая аповесць “Загадка Неферціці”, якую напісаў яшчэ старшакласнікам; вызначаецца

асаблівае месца рамана “Хрыстос прызямліўся ў Гародні” (1966), у якім пісьменнік выкарыстаў “цэлы набор класічнага прыгодніцкага рамана – гэта і інтрыгуючы сюжэт з нечаканымі развязкамі, і дэшыфроўка тэкстаў, і пагоні, і бойкі, і каханне”; заўважаецца, што “сапраўдную вядомасць прынесла аўтару гісторыка-прыгодніцкая аповесць “Дзікае паляванне караля Стаха” (1958, апубл. 1964), пра якую Васіль Быкаў казаў: «Створаная паводле выпрабаваных канонаў прыгодніцкай рамантыкі, гэтая аповесць мае і нешта адметнае ў сваёй структуры, нейкую ўласцівую ёй таямніцу-загадку, якую нават цяжка растлумачыць з пазіцый фармальнай логікі, а можна хіба адчуць»” [2].

У раздзеле пра беларускую дэтэктыўную прозу сцвярджаецца, што “першым беларускім пісьменнікам, які звярнуўся да гэтага літаратурнага напрамку, з’яўляецца Уладзімір Караткевіч, талент якога раскрыўся ў жанры гістарычнага дэтэктыву”. Паведамляецца, што аповесць “Дзікае паляванне караля Стаха” крытыкі параўноўвалі з вядомай аповесцю А. Конан Дойла “Сабака Баскервіляў”; зноў згадваецца, што сам Караткевіч любіў сябе называць беларускім Аляксандрам Дзюма, “пры тым што любіў наш пісьменнік чытаць і Конан Дойла і Дзюма”; распавядаецца “годная старонкі дэтэктыўнага раману гісторыя”, што здарылася з “Дзікім паляваннем”, і пра тое, што, па прызнанні пісьменніка, дэтэктывы ён пісаў для жонкі, а “Чорны замак Альшанскі” ёй прысвечаны [1].

Мы заўважылі, што аповесць “Дзікае паляванне караля Стаха” даследчыкамі разглядаецца і як гісторыка-дэтэктыўная, і як гісторыка-прыгодніцкая. Гэта адзін з найбольш вядомых твораў У. Караткевіча і першая яго спроба ў дэтэктыўным жанры. Аднак “у адрозненне ад «чыстага» дэтэктыва пісьменнік паказаў беларускае грамадства 80-х гадоў XIX ст. не толькі ў яго супярэчнасцях, але і ў яго нацыянальнай, культурнай і гістарычнай своеасаблівасці. Для У. Караткевіча важна было паказаць каларыт, атмасферу беларускага грамадства мінулай эпохі. У аповесці шмат гістарычных апісанняў, этнаграфічных і бытавых падрабязнасцей” [3, с. 368].

У аповесці “Дзікае паляванне караля Стаха” мастак слова зрабіў цікавы сюжэтны ход. Ён паказаў, як легенду пра караля Стаха і яго паляванне ва ўласных мэтах выкарысталі злыя і хцівыя людзі, і яна такім чынам набыла новы сэнс. Праз вобраз дзікага палявання пісьменнік асудзіў сацыяльны прыгнёт, тыранію, уціск і дэспатызм ва ўсіх іх жахлівых праяўленнях.

Паспяхова выкарыстаў прыёмы дэтэктыўнага жанру У. Караткевіч і ў рамане “Чорны замак Альшанскі”. У творы таямніча ці загадкава паміраюць героі, ёсць дынамічныя вострасюжэтныя апісанні, не абыходзіцца, як часта бывае ў творах падобнага плана, без міліцыі, графа-

лагічнай экспертызы. Аднак даследчык А. Верабей гэта ўсё лічыць знешнімі прыкметамі жанру. "Аўтар і сам крытычна ставіцца да іх. Вуснамі аднаго з персанажаў сцвярджае: «Нічога гэтага не будзе. І перастрэлкі таксама. Бо – досыць стандартаў». Уладзімір Караткевіч хоча раскрыць нешта вельмі ўласнае, глыбока перажытае, выпакутаванае і адначасова грамадска значнае, агульначалавечае, важнае для ўсіх" [4, с. 265]. У сваім рамане пісьменнік выступіў супраць духоўнага спусташэння чалавека. Ён імкнуўся раскрыць не прыватную і займальную гісторыю, што здарылася з ягоным героем, а паспрабаваць выявіць повязь паміж мінуўшчынай і сучаснасцю, раскрыць жыццё ва ўсіх яго складанасцях і супярэчнасцях, сцвердзіць думку пра неперможнасць і ўсемагутнасць дабра і чалавечнасці.

Змест рамана "Хрыстос прызямліўся ў Гародні" не вычэрпваецца толькі апісаннем прыгод Юрася Братчыка і ягоных апосталаў. Ён значна глыбейшы. Сам пісьменнік адзначыў, што гэта "не камедыя і не трагедыя, а трагікамедыя, смех праз слёзы, народная драма, калі хочаце" [5, с. 10]. Прыгодніцкі сюжэт У. Караткевіч напоўніў сацыяльна-філасофскім і псіхалагічным зместам, багата выкарыстаў матэрыялы хронік і летапісаў, біблейскія тэксты і вытрымкі з мастацкіх твораў, народныя выслоўі. "Твор вызначаецца стылёвай парадаксальнасцю і поліфанізмам. У ім спалучыліся рэальнае і нерэальнае, высокае і нізкае, іронія і гарэзлівасць. Такія асаблівасці дазваляюць гаварыць пра тое, што ў рамане выявіліся стылёвыя рысы барока і постмадэрнізму" [3, с. 378].

У рамане "Хрыстос прызямліўся ў Гародні" сцвярджаюцца высокія гуманістычныя ідэалы праўды, справядлівасці, дабра. З махляра галоўны герой пераўтвараецца ў абаронцу людзей. І ў гэтым агульначалавечая і мастацкая каштоўнасць рамана.

У аповесці "Ладдзя Роспачы" У. Караткевіч па-майстэрску выкарыстаў прыём жанру фальклорных і агіяграфічных твораў, паказаў прыгоды Вылівахі ў падземным царстве, яго гульню са Смерцю ў шахматы на ягонае жыццё, а пасля і на жыццё іншых людзей. Выкарыстанне прыгодніцкага сюжэту і героя-авантурыста дазволіла У. Караткевічу сцвярджаць, што нельга перамагчы чалавека, нельга перамагчы народ, "які жыў насупор і не так і ўзрошчваў шыпы на сваіх карэннях, а не на сцяблінах" [6, с. 162], нельга перамагчы жыццё. Пісьменнік пераконваў, што прага да жыцця здольна на немагчымае: "Рабі нечаканае, рабі, як не бывае, рабі, як не робіць ніхто, – і тады пераможаш... Таму што толькі дурні разважаюць заўсёды па правілах здаровага сэнсу" [6, с. 162].

Твор вызначаецца раскаванай манерай апавядання, разам з тым ён прасякнуты глыбокім роздумам пісьменніка над сутнасцю жыцця і лёсам роднай зямлі.

Ствараючы сваю дэтэктыўна-прыгодніцкую прозу, У. Караткевіч арыентаваўся на вядомыя ў сусветным мастацтве творы, на чым і сам акцэнтаваў неаднаразова ўвагу. Прыёмы дэтэктыву і прыгодніцкай літаратуры пісьменнік выкарыстоўваў больш дзеля знешняга аздаблення твораў, дзеля жанрава-стылёвага ўзбагачэння нацыянальнай літаратуры. Для У. Караткевіча і ў гэтых творах важна было паказаць беларускае грамадства мінулых часоў. У іх ставяцца вечныя пытанні аб прызначэнні чалавека на зямлі, аб сутнасці ягонага жыцця і любові да радзімы, паказваецца прыгожае і чыстае каханне.

## Библиографический список


1. Беларуская дэтэктыўная проза [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Беларуская_дэтэктыўная_проза. – Дата доступу: 07.05.2023.

2. Беларуская прыгодніцкая проза [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Беларуская_прыгодніцкая_проза. – Дата доступу: 07.05.2023.

3. *Верабей, А.* Уладзімір Караткевіч / А. Верабей // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. – Мінск, 2001–2015. – Т. 4. Кн. 1. – 2002. – С. 361–390.

4. *Верабей, А.* Уладзімір Караткевіч: жыццё і творчасць / А. Верабей. – Мінск : Беларуская навука, 2005. – 271 с.

5. *Караткевіч, У.* Зб. тв. : у 8 т. Т. 8. Кн. 2 : З жыццяпісу ; Нарысы ; Эсэ ; Публіцыстыка ; Постаці ; Крытыка ; Інтэрв`ю ; Летапіс жыцця і ворчасці / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 1991. – 494 с.

6. *Караткевіч, У.* Ладдзя Роспачы / У. Караткевіч // Зб. тв. : у 8 т. Т. 2 : Аповесці ; Апавяданні ; Казкі / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 1988. – С. 130–169.